

Сяргей ЕЛІЗАРАЎ

# Пад сцягам "абвастрэння класавай барацьбы": выбарчыя кампаніі ў мясцовыя Саветы БССР у 1920-я гады

*У 1920-я гады адзінай рэальнай магчымасцю для большасці насельніцтва Савецкай Беларусі ўплываць на фарміраванне вертыкалі ўлады былі выбары ў сельскія Саветы. Яны праходзілі штогод, а сам працэс іх правядзення і вынікі адлюстроўвалі ўстаноўкі і падыходы ўлады. Агульнай тэндэнцыяй было "абвастрэнне класавай барацьбы", аднак у сярэдзіне 1920-х гг. назіраліся, тым не менш, паслабленні для небядняцкіх слаёў насельніцтва і пэўная дэмакратызацыя выбарчага працэсу.*

Бальшавіцкае кіраўніцтва заўсёды адкрыта заяўляла аб непрыняцці "буржуазных" уяўленняў пра дэмакратыю і імкненні стварыць новы (на іх думку, вышэйшы) — савецкі тып дэмакратыі. У 1921 г. У.І.Ленін заяўляў: *"савецкі лад ёсць максімум дэмакратызму для працоўных і сялян, і ў той жа час ён азначае разрыў з буржуазным дэмакратызмам і ўзнікненне новага, сусветна-гістарычнага, тыпу дэмакратыі, менавіта: пралетарскага дэмакратызму або дыктатуры пралетарыяту"*[1]. Вызначальным момантам у разуменні гэтага новага тыпу дэмакратыі з'яўлялася ідэяператварэння пралетарыяў і самых бедных сялян-паўпралетарыяў у *"пастаянную і адзіную аснову ўсяго дзяржаўнага апарату"*, а таксама *"няўхільнае падаўленне супраціву эксплуататараў"*. Для дасягнення гэтага прызнавалася не толькі магчымым, але і неабходным пазбаўленне "эксплуататараў" палітычных правоў і свабод[2]. Аналізуючы і ацэньваючы выбарчыя кампаніі 1920-х гг., варта ўлічваць гэтыя прынцыповыя ўяўленні кіруючых партыйна-савецкіх колаў аб савецкім тыпе дэмакратыі.

Пераход з вясны 1921 г. да мірнага развіцця Савецкай Беларусі суправаджаўся завяршэннем распачатай яшчэ ўзімку 1920 г. замены рэўкамаў (рэвалюцыйных камітэтаў) як надзвычайных ваенных органаў улады грамадзянскімі структурамі — ***Саветамі***, якія фарміраваліся на выбарнай аснове. Насельніцтва непасрэдна ўдзельнічала толькі ў выбарах нізавых структур — сельскіх і гарадскіх Саветаў, па выніках якіх вызначаўся персанальны склад гэтых Саветаў, а таксама дэлегаты на валасныя з'езды Саветаў. У сваю чаргу валасныя з'езды абіралі валасныя выканкамы і дэлегатаў на павятовы з'езд, павятовы — адпаведна павятовыя выканкамы і дэлегатаў на Усебеларускі з'езд Саветаў. Пры наяўнасці такой сістэмы для большасці насельніцтва рэспублікі — сялян — адзінай рэальнай магчымасцю ўплываць на фарміраванне ўсёй вертыкалі ўлады былі выбары ў сельсаветы.

Для арганізацыі выбараў 1921 г. у мясцовыя Саветы ЦВК і СНК ССРБ прынялі адпаведныя інструкцыі: у красавіку — для выбараў у сельскія, у ліпені — у гарадскія і местачковыя Саветы[3]. Выбары ў сельскія, гарадскія і местачковыя Саветы (са спасылкай на Канстытуцыю РСФСР) прызначаліся выканкамамі і праводзіліся адзін раз у тры месяцы*. Інструкцыі ўтрымлівалі пералік асобаў, пазбаўленых выбарчых правоў у



***ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч.***

*Загадчык кафедры гісторыі і паліталогіі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. У 2013 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)". Аўтар манаграфіі "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009), больш за 170 навуковых і метадычных публікацый.*

адпаведнасці з арт. 65 Канстытуцыі РСФСР. Да іх адносіліся асобы, якія жылі на непрацоўныя даходы (працэнты з капіталу, даходы з прадпрыемстваў і маёмасці і г. д.), звярталіся да наёмнай працы з мэтай атрымання прыбытку, прыватныя гандляры, манахі і слугі цэркваў і рэлігійных культаў і г. д.

Для правядзення выбараў ствараліся выбарчыя камісіі (павятовыя, валасныя, гарадскія, мястэчковыя і сельскія), якія фарміраваліся мясцовымі органамі ўлады і імі ж кантраляваліся. Выбары праводзіліся на выбарчых сходах і лічыліся здзейсненымі пры ўмове прысутнасці паловы выбаршчыкаў. Аднак, паколькі актыўнасць сялян на выбарах была нізкая, пры строгім выкананні гэтага патрабавання ў многіх месцах выбары наогул бы не адбыліся. Таму пакідалася магчымасць прызнання выбараў здзейсненымі і пры меншай колькасці прысутных выбаршчыкаў, але толькі пры ўмове *"своечасовага апавяшчэння выбаршчыкаў аб сходзе"*. Галасаванне (на той момант адкрытае) магло праходзіць або па кожнай кандыдатуры асобна, або па цэлым спісе. Абраным лічыўся кандыдат, які атрымаў простую большасць галасоў прысутных выбаршчыкаў.

Першыя пасля афіцыйнага завяршэння польска-савецкай вайны выбары ў мясцовыя Саветы адбыліся ўлетку 1921 г. у трох паветах — Мазырскім, Мінскім і Барысаўскім. У трох астатніх (Бабруйскім, Слуцкім і Ігуменскім) яны былі адмененыя рэспубліканскім ЦВК з-за высокай актыўнасці антысавецкіх і крымінальных узброеных фарміраванняў[4].

Паўсюдныя ж выбары ва ўсе мясцовыя Саветы былі праведзены ***ў лістападзе — снежні 1921 г.*** У ходзе іх беларускаму партыйна-савецкаму кіраўніцтву ўдалося вырашыць галоўную задачу — забяспечыць кіраўніцтва пануючай бальшавіцкай партыі цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады. Сярэднестатыстычны член валаснога выканкама істотна не адрозніваўся ад свайго папярэдніка 1920 г.: мужчына ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў з ніжэйшай адукацыяй, селянін, бальшавік (у большасці выпадкаў) або беспартыйны. Камуністам належала абсалютная большасць месцаў (81%) у зноў абраных павятовых выканкамах, а таксама большасць абраных на павятовых з'ездах дэлегатаў на III Усебеларускі з'езд Саветаў (72%). Партрэт дэлегата III Усебеларускага з'езда Саветаў выглядаў так: беларус, камуніст, ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў, з сярэдняй або ніжэйшай адукацыяй, з сялян або рабочых[5].

Пераход да мірнага развіцця і нэпа ствараў для бальшавіцкай улады небяспеку актывізацыі непралетарскіх слаёў насельніцтва, пранікнення іх ва ўладныя мясцовыя структуры. У гэтай сувязі ранейшы курс ваеннага часу на забеспячэнне дамінавання ў мясцовых органах улады бядняцкіх слаёў насельніцтва заставаўся ў сіле.

***Выбарчая кампанія 1922 г.*** праводзілася ранейшымі метадамі ваеннага часу з адвольным тлумачэннем выбарчага заканадаўства, выкарыстаннем сістэмы выбараў сялян у члены сельсаветаў "па чарзе", з парушэннямі ў пытанні пазбаўлення выбарчых правоў[6]. Кандыдатуры членаў у сельсаветы вылучаліся валаснымі выканкамамі і мясцовымі бальшавіцкімі арганізацыямі з бяднейшага сялянства і дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. У пераважнай большасці яны атрымлівалі падтрымку на выбарчых сходах галасамі такіх жа беднякоў, складаючы прасавецкае ядро органаў савецкай улады ў вёсцы.

У сельсаветах і валасных выканкамах была сфарміравана бядняцкая большасць, якая складала 56% і 70% адпаведна. Чым вышэй па статусе быў орган улады, тым меншым у ім было прадстаўніцтва сераднякоў і заможных. Так, калі ў сельсаветах серадняні склалі 38%, а заможныя — 6%, то ў валвыканкамах — адпаведна 32% і 1% [7].

На павятовых з'ездах Саветаў перавага бядняцка-бальшавіцкіх прадстаўнікоў забяспечыла перавагу камуністаў і беднаты ў павятовых выканкамах. У выніку сярод 66 іх членаў толькі два былі беспартыйныя, а ўсе праходзілі па катэгорыі "бедната" (нават тыя, хто па сацыяльным становішчы адносіўся да "інтэлігенцыі" і "рабочых")[8].

Такім чынам, пераход да мірнага жыцця, нягледзячы на знешнія змены і замену надзвычайных органаў улады (рэўкамаў) на грамадзянскія выбарныя органы (Саветы), не прывёў да значных зменаў у метадах правядзення выбарчых кампаній і фарміравання органаў мясцовай улады.

Пачынаючы з 1923 г. выбарчыя кампаніі ў мясцовыя органы ўлады сталі праходзіць ва ўмовах фарміравання новага афіцыйнага курсу — "Тварам да вёскі", які ў першую чаргу арыентаваў усе мясцовыя партыйныя і савецкія структуры на рашэнне задач хуткага аднаўлення эканомікі. Прычым хуткі ўздым менавіта сельскай гаспадаркі павінен быў стаць асновай будучага росту савецкай эканомікі і яе індустрыялізацыі. Неабходным элементам такой палітыкі ўлады лічылі павышэнне аўтарытэту мясцовых Саветаў сярод сялянства і ажыўленне іх дзейнасці перш за ўсё ў рашэнні мясцовых сацыяльна-эканамічных задач.

Нават першыя, зробленыя яшчэ ў самым агульным выглядзе заявы аб пераходзе да новага курсу савецкай улады ў вёсцы актывізавалі цікавасць сялянства да працэсаў фарміравання мясцовых органаў улады. Ужо на ***выбарах 1923 г.*** партыйныя і савецкія органы адзначалі *"крытычнае стаўленне сялян да выбараў новых і справаздач старых сельсаветаў"*, паступовы адыход іх ад метаду "чарговасці знаходжання ў сельсавеце", "бадзёрае", "спачувальнае" і "свядомае" стаўленне да перавыбараў Саветаў. Пры гэтым узрастала актыўнасць заможных сялян, якія імкнуліся правесці ў сельсаветы сваіх кандыдатаў[9]. Аднак

* Паводле рашэння III Усебеларускага з'езда Саветаў (снежань 1921 г.), тэрмін дзеяння мясцовых Саветаў быў падоўжаны да 6 месяцаў, а ў кастрычніку 1922 г., згодна з палажэннем ЦВК ССРБ аб сельсаветах, — да аднаго года.

ніякіх прынцыповых змяненняў у падыходах да выбараў беларускага партыйна-савецкага кіраўніцтва не адбылося. У 1923 г. выбары прайшлі па сцэнары папярэдніх гадоў з неабходнымі для ўлады вынікамі.

***Выбары 1924 г.*** праводзіліся ўжо ва ўмовах новага курсу "Тварам да вёскі". Аднак у БССР гэта паранейшаму не азначала якіх-небудзь змен у падыходах да іх арганізацыі. У новай выбарчай кампаніі ЦК КП(б)Б ставіў перад мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі традыцыйную задачу *"яшчэ больш умацаваць і ўзмацніць сувязь нашай партыі і органаў савецкай улады з шырокімі масамі працоўных і сялян"*, залучаючы ў яе *"шырокія пласты працоўных мас горада і вёскі"*. Сельсаветы, як і раней, павінны былі фарміравацца перш за ўсё з сялянскай беднаты, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, парабкаў і *"лепшай часткі інтэлігенцыі, адданай савецкай уладзе"*[10].

У гэтым жа 1924 г. у БССР адбылася адміністрацыйна-гаспадарчая рэформа, па выніках якой у рэспубліцы была створана новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная сістэма: сельсавет — раён — акруга. Адпаведна перабудоўвалася сістэма мясцовых органаў улады і кіравання: сельскі Савет — раённы Савет — акруговы Савет.

Афіцыйныя вынікі выбараў 1924 г. у сельсаветы для ўладаў былі аптымістычныя. Даклады камандзіраваных на месцы прадстаўнікоў, пратаколы і справаздачы акруговых выканкамаў і акруговых выбарчых камісій сведчылі, што выбары ў сельсаветы *"прайшлі цалкам паспяхова і здавальняюча"*. У сельсаветах абсалютную большасць атрымалі бедныя і серадня-кі (прычым "найбольш пралетарскія пласты сялянства" — бясконныя і вызваленыя ад сельгаспадатку, парабкі і рабочыя — склалі 38% членаў сельсаветаў), доля камуністаў павялічылася з 3,6% да 8%. У райвыканкамах "найбольш пралетарскія пласты" склалі 46,4%, члены і кандыдаты ў члены КП(б)Б — 60% абраных[11].

Найбольшую актыўнасць падчас кампаніі партыйныя органы фіксавалі з боку заможных сялян, якія імкнуліся правесці ў сельсаветы сваіх кандыдатаў. Яны праводзілі асобныя сходы (якія не афішавалі), рыхтавалі свае спісы кандыдатаў і актыўна іх адстойвалі, агітуючы супраць камуністаў і камсамольцаў, заклікалі арганізоўваць сялянскія саюзы для абароны інтарэсаў сельскага насельніцтва.

Таксама партыйныя і савецкія органы фіксавалі ўзмацненне актыўнасці сераднякоў, якія спрабавалі пазіцыянаваць сябе самастойнай (і ад беднякоў, і ад заможных) сілай пад лозунгам *"справядлівых, паступаючых па законе Саветаў"*. Серадпякі мала давяралі афіцыйным кандыдатам ад улады, імкнуліся падбіраць і праводзіць сваіх. Найменшую актыўнасць праяўлялі беднякі. Камуністычныя ячэйкі і іх кандыдатаў актыўна падтрымлівала бядняцкая і серадняцкая моладзь, а таксама дэмабілізаваныя чырвонаармейцы[12].

Недахопамі выбарчай кампаніі (сярод якіх перш за ўсё былі адміністрацыйны ціск, парушэнне заканадаўства аб пазбаўленні выбарчых правоў) у большасці справаздач, дакладаў і інфармацый спачатку надаваўся прыватны характар. Разам з тым у шэрагу дакументаў сцвярджалася, што колькасць парушэнняў значна большая, шмат утоена *"паміж радкамі казённых справаздач "аб здавальняючых" перавыбарах"*, што ў сялян *"засталося нявыказаныя [меркаванні] з-за таго, што "ўсё роўна свайго пасадзяць"*[13]. Нягледзячы на заявы аб узрослай палітычнай і грамадскай свядомасці сялянства, фіксавалася значнае скарачэнне яўкі на выбары. Паводле афіцыйных даных, у сярэднім па рэспубліцы ў выбарах прынялі ўдзел толькі 35,5% асобаў з тых, хто меў на гэта права (для параўнання: у 1923 г. — 45,3%)[14]. І гэта з улікам таго, што традыцыйна звесткі аб яўцы людзей на выбары даваліся прыблізна і заўсёды былі перабольшаныя. Тым не менш значны спад выбарчай актыўнасці ніякай асаблівай трывогі ў беларускага кіраўніцтва (як мясцовага, так і рэспубліканскага) не выклікаў. Выбары адбыліся, а вынікі фарміравання мясцовых органаў улады партыйна-савецкае кіраўніцтва цалкам задаволілі.

Таму ўказанні з Масквы перагледзець вынікі сталі для беларускай кіруючай вертыкалі нечаканасцю. Звязана ж гэтае рашэнне было з тым, што па ўсім СССР пры правядзенні мясцовых выбараў у Саветы 1924 г. было выяўлена шмат парушэнняў, якія ішлі насуперак партыйнаму курсу "Тварам да вёскі", лініі на актывізацыю дзейнасці нізавых Саветаў і прыцягненню да кіравання шырокіх серадняцкіх слаёў. У пастанове Прэзідыума ЦВК СССР ад 16 студзеня 1925 г. называліся дзве галоўныя падставы для адмены вынікаў выбараў: меншая за 35% яўка выбаршчыкаў і наяўнасць скаргаў грамадзян на незаконныя дзеянні органаў і ўстаноў, якія кіравалі выбарамі. Прычым вынікі выбараў адмяняліся нават пры наяўнасці толькі адной з названых падстаў. Яны маглі быць адмененыя як па ўсёй тэрыторыі губерні або акругі, так і ў якой-небудзь іх частцы. Цэнтральныя ўлады звярталі ўвагу мясцовых органаў на *"неабгрунтаваныя і незаконныя пазбаўленні выбарчых правоў* [тых] *грамадзян"*, якія *"паводле дакладнага сэнсу адпаведных артыкулаў канстытуцый саюзных рэспублік выбарчых правоў не пазбаўляюцца"*[15].

У Савецкай Беларусі такая пазіцыя вышэйшага саюзнага кіраўніцтва першапачаткова падтрымкі не атрымала. На студзеньскім (1925 г.) Пленуме ЦК КП(б)Б прагучала аптымістычная ацэнка ходу і вынікаў выбарчай кампаніі 1924 г. У чарговы раз гаварылася аб значным росце актыўнасці ўсіх груп насельніцтва, узмацненні класавага расслаення і абвастрэнні класавай барацьбы ў вёсцы, росце ўплыву камуністаў і камсамольцаў. Нізкая яўка выбаршчыкаў тлумачылася галоўным чынам тэхнічнымі прычынамі — павелічэннем адлегласці да цэнтраў сельсаветаў пасля іх узбуйнення. Наяўнасць адміністрацыйнага ціску як прычыны сялянскага абсентэізму беларускае партыйнае кіраўніцтва прызнала хутчэй пад прымусам Масквы, чым зыходзячы з уласнага аналізу сітуацыі ў рэспубліцы. Прычым

на пленуме было сказана толькі пра "асобныя выпадкі" адміністрацыйнага ціску ў выбарчай кампаніі 1924 г. і толькі *"па асобных адміністрацыйных раёнах"*[16].

Аднак спроба беларускага кіраўніцтва абмежаваць перавыбары толькі тымі сельсаветамі, дзе яўка склала менш за 15%, не ўдалася. Як вынік, у гэтай справе давялося кіравацца саюзнымі крытэрыямі. 31 студзеня 1925 г. адпаведнае рашэнне было аформлена Прэзідыумам ЦВК БССР, які (услед за ЦК КП(б)Б) назваў у якасці галоўнай прычыны паўторных выбараў *"неадпаведнасць ранейшай сістэмы выбараў умовам новага адміністрацыйнага дзялення Рэспублікі"*, зусім не згадваючы аб парушэннях падчас выбарчай кампаніі 1924 г.[17].

Стаўленне мясцовых партыйных органаў да адмены вынікаў выбараў 1924 г. было неадназначнае. На месцах сталі асцерагацца, што *"ў выніку гэтага кроку могуць набыць значны ўплыў заможныя пласты сялянства, найбольш актыўнага"*. Таксама насцярожвалі меркаванні сялян адносна таго, што новыя выбары дазволяць *"вызваліць Саветы ад камуністаў"*, а таксама павелічэнне актыўнасці перш за ўсё заможнай часткі сялянства пры адначасовым узмацненні песімізму беднаты.

Асноўная частка сялянства разглядала рашэнне аб адмене вынікаў выбараў як паказчык імкнення ўлады змяніць падыходы да вясковай палітыкі: *"камуністы апамяталіся, што трэба ісці разам з намі, а не дыктаваць"*, *"партыя <...> вырашыла звярнуць самую вялікую ўвагу на тое, каб мы маглі быць самі гаспадарамі на вёсцы, а не тое, каб з намі не лічыліся"*[18]. У людзей упершыню з'явілася надзея на правядзенне па-сапраўднаму свабодных выбараў. Паводле звестак з месцаў, на перавыбарчых сходах сяляне сталі *"смялей выказвацца наогул, смялей і настойлівей прад'яўляць патрабаванні"*, *"вёска пачынае падымаць галаву з надзеяй на новую савецкую ўладу і новыя сапраўдныя савецкія парадкі"*[19]. Па сутнасці, улады прызналі, што папярэднія выбары праходзілі пад моцным адміністрацыйным ціскам і ў сітуацыі адсутнасці рэальнай свабоды волевыяўлення.

Заможныя сяляне разам са святарамі пачалі актыўна агітаваць сялян за сваіх кандыдатаў. Бедната без прамой і жорсткай падтрымкі з боку ўлады аказалася да перавыбараў не гатовай. Найбольшую актыўнасць праявіла серадняцтва, якое, *"не будучы захопленым ні заможнымі, але і адціснуўшы і беднату"*, і вызначыла зыход перавыбараў вясны 1925 г.[20].

***Перавыбары пачатку 1925 г.*** былі праведзены ў 670 з 1206 сельсаветаў (55,6%). Яўка склала ў сярэднім 42,5%. Ва ўмовах абмежавання выкарыстання "адміністрацыйнага рэсурсу" назіралася паўсюднае ўмацаванне пазіцый серадняцтва і рэзкае змяншэнне долі беднаты ва ўсіх выбарных органах улады. Так, у сельсаветах доля сялян без коняў скарацілася з 13,7% да 12,3%, вызваленых ад сельгаспадатку — з 12,1% да 6,5%, парабкаў і рабочых — з 5,9% да 3,4%. Яшчэ ў большай ступені бедната страціла свае пазіцыі на ўзроўні новых старшыняў сельсаветаў: на гэтую пасаду не быў абраны ніводны вызвалены ад сельгаспадатку селянін (у 1924 г. такіх было 10,5%), бясконныя старшыні склалі толькі 0,3% замест ранейшых 29,3%. Доля камуністаў сярод старшыняў сельсаветаў скарацілася з 33,6% да 27,7%, камсамольцаў — з 8,5% да 6,7%[21].

Падобная тэндэнцыя праявілася і па выніках перавыбараў у 71 (з 100) райвыканкам: у іх бясконныя сяляне склалі 16,5% (раней — 18,4%), вызваленыя ад падатку — 4,3% (замест 13,8%), парабкі і рабочыя — 13,2% (замест 34,6%). Сярод старшыняў райвыканкамаў, як і раней, усе былі камуністамі[22].

Сур'ёзным недахопам праведзенай выбарчай кампаніі заставалася адвольнае тлумачэнне на месцах заканадаўства аб пазбаўленні выбарчых правоў. Такая сітуацыя адзначалася па ўсёй тэрыторыі СССР: выбарчых правоў пазбаўлялі саматужнікаў, якія мелі падсобныя прадпрыемствы, служыцеляў пры храмах і дамах культу, вартаўнікоў, пеўчых, арганістаў, членаў царкоўных саветаў і г. д. У сувязі з гэтым Прэзідыум ЦВК СССР 8 красавіка 1925 г. быў вымушаны зноў звярнуць увагу ЦВК саюзных рэспублік на неабходнасць строгага выканання выбарчага заканадаўства[23].

*Відавочна, што перавыбары пачатку 1925 г.* аказаліся першымі ва ўмовах савецкай улады дастаткова дэмакратычнымі. Ва ўмовах практычнай адсутнасці адміністрацыйнага ціску выбары ў сельсаветы прадэманстравалі рэальную палітычную барацьбу інтарэсаў розных груп сялянства, у якой у большасці выпадкаў бедныкі выступалі разам з серадлякамі. Вырашальнай фігурай у сельсаветах стаў серадняк, зацікаўлены ў ператварэнні іх у дзеючы орган мясцовай улады, пашырэнні ролі ў вырашэнні мясцовых эканамічных і сацыяльна-культурных праблем. Таксама выбары прывялі да ўзмацнення даверу сялян да савецкай улады. Нягледзячы на скарачэнне долі камуністаў у сельсаветах, на справе аўтарытэт КП(б)Б у вёсцы ўзрос: *сяляне галасавалі* супраць канкрэтных камуністаў, якія дыскрэдытавалі сябе ў іх вачах, і пры гэтым у масавым парадку прасілі вышэйстаячыя партыйныя органы даслаць для працы ў сельсаветах "сумленных камуністаў". Увесну 1925 г. беларускае партыйна-савецкае кіраўніцтва выяўляла аптымізм, канстатуючы паварот асноўнай масы сялянства ў бок свядомай падтрымкі савецкай улады.

У ходзе наступнай выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы ***(снежань 1925 г. — люты 1926 г.)*** улады вырашалі задачу замацавання пазітыўных тэндэнцый папярэдніх выбараў. Уся выбарчая кампанія выразна дзялілася на тры часткі: папярэднюю (падрыхтоўка насельніцтва да выбараў), справаздачную (справаздачы перад насельніцтвам мясцовых органаў улады) і непасрэдна выбарчую. Прымаліся меры, каб выправіць відавочныя парушэнні выбарчага заканадаўства: так, да пачатку новай выбарчай кампаніі па рэспубліцы былі аднаўленыя ў выбарчых правах да 30% асобаў, якія раней іх былі пазбаўленыя[24]. У цэ-

лым партыйныя і савецкія органы адзначалі адсутнасць пры выбарах адміністрацыйнага ціску (*"сяляне там, дзе партыйцы або камсамольцы не праявілі сябе, свабодна правальвалі іх"*), не адмаўляючы пры гэтым асобных выпадкаў яго выкарыстання[25].

Як і раней, ход і вынікі перавыбараў партыйна-савецкія органы ацэньвалі галоўным чынам з пункту гледжання класавай барацьбы ў вёсцы. Яны ў чарговы раз фіксавалі "абвастрэнне класавай барацьбы", хоць нічога прынцыпова новага ў дачыненні да розных слаёў сялянства і іх паводзінаў на перавыбарах 1926 г. не адзначалася. Заможная частка сялянства, як і раней, на справаздачных сходах актыўнасці не выяўляла, але арганізоўвалася па-за іх межамі: праводзіла адкрытыя ўласныя сходы ў процівагу афіцыйным зборам беднаты, вяла індывідуальную работу з сялянамі, рыхтавала ўласныя спісы кандыдатаў у члены сельсаветаў, аказвала эканамічны ціск на беднату[26].

Бедната ж па-ранейшаму паводзіла сябе пасіўна. Улады адзначалі сярод яе моцныя *"ўтрыманскія настроі і ўраўняльныя тэндэнцыі, якія адштурхоўваюць ад яе серадняка"*. Найбольшую актыўнасць зноў праявілі сераднякі. Аднак у адрозненне ад вясны 1925 г., калі яны паўсюдна выступалі разам з беднатой супраць заможнай часткі вёскі, на гэты раз намецілася пэўная дыферэнцыяцыя. Менш забяспечаныя ішлі ў саюзе з беднатой, больш забяспечаныя вагаліся. Найбольшыя асцярогі ў партыйных інстанцыях (нягледзячы на адзінкавыя факты) выклікалі тыя з іх, хто *"злучаўся з кулаком на базе блізкіх уласніцкіх інтарэсаў"*, выказваючы незадаволенасць "бедняком-гультаём" і нададзенымі яму ўладай эканамічнымі льготамі[27]. У цэлым жа адзначалася ўмацаванне ранейшай тэндэнцыі аб'яднання сераднякоў з беднатой. Ацэньваючы перавыбары Саветаў 1926 г., аб'яднаны Пленум Цэнтральнага камітэта і Цэнтральнай кантрольнай камісіі ВКП(б) (ліпень 1926 г.) назваў іх *"першай пасля заканчэння грамадзянскай вайны і ўмацавання пралетарскай дыктатуры шырокай і адкрытай выбарчай кампаніяй"*, у якой упершыню *"выступілі адкрыта <...> асноўныя сацыяльныя групы выбаршчыкаў горада і вёскі"*[28]. Яўка на выбары ў сельсаветы нават перавысіла адпаведную яўку вясны 1925 г. і склала 46,5% асобаў, маючых выбарчае права[29].

Як паўсюдна адзначалася ў розных справаздачах і зводках аб ходзе і выніках перавыбараў 1926 г., за рэдкім выключэннем намечаныя партыйнымі і савецкімі органамі кандыдатуры праходзілі ў склад сельсаветаў. Тэндэнцыя скарачэння сярод членаў сельсаветаў долі прадстаўнікоў самых бедных слаёў насельніцтва захавалася, а вось сярод старшыняў сельсаветаў (якія часцей за ўсё аднаасобна вырашалі пытанні, што адносіліся да кампетэнцыі сельсаветаў) іх доля зноў значна ўзрасла *(гл. табліцу 1)*. Уладам усё ж больш падыходзіў на гэтай пасадзе бядняк, а не серадняк. *Апошні быў больш самастойны ў сваіх дзеяннях*, менш эканамічна залежны і ў меншай ступені паддаваўся кантролю.

*Табліца 1*

**Склад членаў сельсаветаў БССР 1924—1926 гг. па маёмасным становішчы**[30]

| Сельсаветы | Вызваленыя ад сельгаспадатку (%) | | |
|---|---|---|---|
| | 1924 г. | 1925 г. | 1926 г. |
| **Члены** | 25,8 | 19,2 | 14,1 |
| **Старшыні** | 39,8 | 0,3 | 22,3 |

Раённыя з'езды Саветаў прайшлі ў патрэбным для ўлады рэчышчы — *"дзелавіта і ажыўлена"*. У складзе райвыканкамаў, які аднавіўся на 50%, доля сялян скарацілася з 47,8% да 40,6%. Пры гэтым доля бясконных паменшылася з 20,7% да 13,1%, а доля вызваленых ад падатку засталася практычна на тым жа ўзроўні (5,1% супраць 4,6%). Пры гэтым (як і ў сельсаветах) рэзка ўзрасла доля беднаты сярод старшыняў райвыканкамаў — выхадцаў з сялянства (з 1% да 46,6% гэтай катэгорыі старшыняў)[31].

Такім чынам, у сярэдзіне 1920-х гг. у працэсе новай афіцыйнай партыйна-дзяржаўнай палітыкі "Тварам да вёскі" ўлады здолелі ў значнай ступені пераадолець негатыўнае стаўленне насельніцтва да выбараў у мясцовыя органы ўлады. Апошнія (перш за ўсё на ўзроўні сельсаветаў) сталі арэнай сапраўднай палітычнай барацьбы, дзе ўладзе давялося выкарыстоўваць шырокі арсенал сродкаў (эканамічных, арганізацыйных, прапагандысцкіх) для фарміравання неабходнага для сябе складу. Вынікі выбараў стала вызначаць пазіцыя сераднякоў, якія праявілі не толькі жаданне артыкуляваць свае інтарэсы як агульнасялянскія, але і здольнасць адстойваць іх ва ўмовах значнага скарачэння адміністрацыйнага ціску з боку ўладаў.

***Наступная выбарчая кампанія — 1927 г.*** — суправаджалася традыцыйнымі заявамі партыйных і савецкіх органаў аб "абвастрэнні класавай барацьбы", хоць, як і ў 1926 г., ніякіх канкрэтных фактаў такога "абвастрэння" ў справаздачах не пазначалася. Па-ранейшаму заўважалася актыўнасць заможных сялян, зноў пералічваліся ўжо вядомыя раней формы яе праяўлення. Для абмежавання гэтай актыўнасці быў выкарыстаны адміністрацыйны рэсурс — прынятая ЦВК БССР 13 лістапада 1926 г. новая інструкцыя па перавыбарах Саветаў пашырыла магчымасці мясцовых выбарчых камісій пазбаўляць выбарчых правоў *"непрацоўны, кулацка-нэпманаўскі элемент"*[32]. У выніку ў перавыбарчую кампанію 1927 г. на 44,5% павялічылася колькасць асобаў, пазбаўленых выбарчых правоў[33].

З 1927 г. партыйныя і савецкія органы пры фарміраванні нізавых уладных структур зноў пачалі арыентавацца ў першую чаргу на бедняка. Падводзячы вынікі перавыбарчай кампаніі 1926 г., аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК ВКП(б) (ліпень 1926 г.) адзначыў *"недастатковую актыўнасць"* беднякоў і асабліва батрацкай *часткі вёскі і паставіў задачу надаць галоўную ўвагу "прыцягненню ў сялянскі актыў парабкаў і беднаты"*, узмацніць ролю і ўплыў гэтай часткі ў актыве, павя-

*Табліца 2*

**Склад членаў сельсаветаў БССР 1926—1927 гг. па маёмасным становішчы**[38]

| Сельсаветы | Вызваленыя ад сельгаспадатку (%) | | Плацілі ў 1927 г. на 1 едака ў гаспадарцы (%) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1926 г. | 1927 г. | 1 руб. | 1-2 руб. | 2—5 руб. | 5—10 руб. | больш за 10 руб. |
| **Члены** | 14,1 | 24,1 | 16,0 | 24,8 | 21,2 | 10,2 | 5,0 |
| **Старшыні** | 22,3 | 25,1 | 17,7 | 26,1 | 20,9 | 10,1 | 3,1 |

лічыць іх долю ва ўсіх органах Саветаў[34]. Партыйныя кіраўнікі чарговы раз зрабілі акцэнт на тое, што галоўнай сацыяльнай апорай улады з'яўляюцца "пралетарыі і найбяднейшыя сяляне-паўпралетарыі". Серадняк жа для іх па-ранейшаму заставаўся дробнабуржуазным элементам, толькі неабходным саюзнікам пралетарыяту ў будаўніцтве сацыялізму, але саюзнікам, які вагаецца, з'яўляецца няўстойлівым і схільным да ўплыву заможнай часткі сялянства. Узмацненне пазіцый сераднякоў у сельсаветах выклікала асцярогі адносна страты кантролю над мясцовымі Саветамі. Павесці ж серадняка па "правільным шляху сацыялістычнага будаўніцтва", на думку камуністычных лідараў, маглі толькі накіраваныя партыйнымі органамі рабочыя і вясковая бедната. Таму Пленум ЦК і ЦКК ВКП(б) арыентаваў усе партыйныя і савецкія органы пры новых перавыбарах у Саветы не столькі на павелічэнне выбарчай яўкі, колькі на ўмацаванне ў новых Саветах іх "пралетарскай часткі"[35].

Развіваючы гэтыя ідэі, лютаўскі (1927 г.) Пленум ЦК ВКП(б) у рэзалюцыі "Аб перавыбарах у Саветы" адзначыў неабходнасць абнаўлення кіруючых органаў Саветаў, у якія павінны быць уцягнутыя *"новыя, сапраўды актыўныя і сапраўды перадавыя элементы рабочых і сялян (асабліва сялян-беднякоў і парабкаў)"*[36].

Работа сярод беднаты зноў стала найважнейшым прыярытэтам партыйна-савецкай дзейнасці ў вёсцы. Акруговыя камітэты КП(б)Б рассылалі па раёнах спецыяльныя лісты аб актывізацыі гэтай работы, правядзенні сходаў беднаты з прыцягненнем серадняка для стварэння "бядняцка-серадняцкага саюза"[37]. У выніку змяншэнне долі найбяднейшага сялянства ў сельсаветах, зафіксаванае ў 1925 і 1926 гг., было спынена. Зноў пачалося павелічэнне бядняцкай часткі членаў сельсаветаў *(гл. табліцу 2)*.

Пры гэтым трэба ўлічваць, што павелічэнне долі беднякоў — членаў сельсаветаў тлумачылася таксама пашырэннем той катэгорыі сялян, якія падпадалі пад вызначэнне "беднята". Гэта было следствам змены падатковага заканадаўства. Да 1926/1927 гаспадарчага года сельскагаспадарчы падатак налічваўся па колькасці зямлі, лугоў і буйной жывёлы, а другарадныя галіны сельскай гаспадаркі (пчалярства, птушкагадоўля, агародніцтва) падаткам увогуле не абкладаліся. З 1926/27 года падатак стаў налічвацца як на галоўныя, так і другарадныя галіны. Гэта, па сцвярджэнні беларускага кіраўніцтва, прывяло да таго, што *"льготы закранулі і некаторую частку і не маламоцных, а нават і заможных"*. У выніку ў БССР было вызвалена ад сельгаспадатку 26,9 % гаспадарак, што карэлюецца з вынікамі выбараў у сельсаветы[39].

У справаздачах аб перавыбарах 1927 г. у сельсаветы адзначалася актыўнасць серадняка, які *"ў абсалютнай большасці выпадкаў на выбарах выступаў сумесна з беднатой, падтрымліваючы прапановы бядняцкіх сходаў, але ў тых мясцовасцях, дзе бедната не была досыць арганізавана і звязана з серадняком, апошнія у асобных выпадках праяўлялі некаторае ваганне, падтрымліваючы часам заможных і кулакоў"*[40].

У перавыбарах 1927 г. прынялі ўдзел 46,2 % выбаршчыкаў[41]. Такім чынам, яўка на перавыбары 1927 г. апынулася практычна на адным узроўні з яўкай 1926 г.

Без складанасцяў прайшлі перавыбары ў гарадскія Саветы. Ва ўсіх гарадах яны адбываліся на выбарных сходах, у большасці выпадкаў (як і раней) асобна для членаў прафсаюзаў, неарганізаваных груп і чырвонаармейцаў (толькі ў некаторых гарадах сходы аб'ядноўвалі ўсе групы выбаршчыкаў). Яўка на выбары ў гарсаветы традыцыйна аказалася вышэй, чым на выбары ў сельсаветы: у акруговых гарадах удзел у выбарах прыняў 61,1% выбаршчыкаў (павелічэнне на 13,3%), у неакруговых — 62,8% (павелічэнне на 16%). Камуністы ў гарсаветах акруговых гарадоў склалі абсалютную большасць — 53,2%, у неакруговых — 36,9%[42].

Перавыбары райвыканкамаў і акрвыканкамаў таксама прайшлі без усялякіх нечаканасцяў. Неабходны кантынгент дэпутатаў раённых і акруговых з'ездаў Саветаў ужо склаўся на ўзроўні першасных структур — сельсаветаў, местачковых і гарадскіх Саветаў. Механізм фарміравання праўладнага складу выканкамаў быў адпрацаваны і збояў не даваў: членамі або кандыдатамі ў члены КП(б)Б з'яўляліся ўсе старшыні райвыканкамаў і акрвыканкамаў, 82,4% членаў прэзідыумаў райвыканкамаў і 92,7% членаў прэзідыумаў акрвыканкамаў[43].

У канцы 1927 г. курс "Тварам да вёскі" быў афіцыйна заменены новым курсам — на калектывізацыю сельскай гаспадаркі (у першапачатковым памяркоўным варыянце). XV з'езд ВКП(б) (снежань 1927 г.) пастанавіў пачаць *"паступовы пераход распыленых сялянскіх гаспадарак на рэйкі буйной вытворчасці (калектыўная апрацоўка зямлі на аснове інтэнсіфікацыі і машынізацыі земляробства)..."*. Зноў стала прыя-

рытэтнай лінія на пашырэнне беспартыйнага бядняцка-серадняцкага актыву перш за ўсё за кошт актыўнага ўцягвання ў яго парабкаў і "маламоцнага" сялянства[44].

***Выбарчая кампанія канца 1928 г. — пачатку 1929 г.*** праходзіла ва ўмовах чарговага абвастрэння крызісу хлебанарыхтовак, выкарыстання ўладамі надзвычайных, гвалтоўных мер па канфіскацыі хлеба ў сялян, вяртання да ранейшых метадаў харчразвёрсткі. У сувязі з гэтым улады былі зацікаўлены як мага хутчэй на практыцы ператварыць сельсаветы ў сапраўдныя *"органы дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы"*, каб з іх дапамогай забяспечыць правядзенне ў вёсцы самаабкладання, узмацніць наступ на кулака пры правядзенні нарыхтовак, прымусіць заможнае сялянства здаць таварныя *залішкі хлеба дзяржаве*, актывізаваць працэс стварэння калгасаў. Галоўнай задачай перавыбарчай кампаніі 1929 г. вераснёўскі (1928 г.) Пленум ЦК КП(б)Б вызначыў *"далейшае ўзмацненне пазіцый рабочага класа, вясковай беднаты і сельскагаспадарчых рабочых"*[45].

Выбарчая кампанія зноў праходзіла пад сцягам *"абвастрэння класавай барацьбы ў вёсцы"*. Рыторыка аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б (28 лістапада — 1 снежня 1928 г.), прысвечанага задачам партыйных арганізацый у перавыбарчай кампаніі Саветаў, літаральна пранізаная гэтай ідэяй. Перавыбары Саветаў 1929 г. паўстаюць як ледзь не вырашальная бітва з "контррэвалюцыйнымі элементамі", гучаць наступныя фразы: *"рашучы наступ на капіталістычныя элементы"*, *"шалёны супраціў і ўзмацненне барацьбы з боку варожых класаў"*, *"падаўленне капіталістычных элементаў"*, *"класавыя ворагі дзейсна рыхтуюцца да перавыбарчай савецкай кампаніі, мабілізуючы ўсе варожыя нам сілы"*, *"кулацтва разгорне на выбарах узмоцненую барацьбу за серадняка"* і г. д.[46].

Сапраўды, можна казаць аб наяўнасці ў той час аб'ектыўных умоў для рэальнага абвастрэння класавай барацьбы ў вёсцы. Жорсткія меры ўладаў па прымусовай канфіскацыі збожжа ў заможнай часткі сялянства і часткі сераднякоў стымулявалі іх антысавецкую актыўнасць аж да дзеянняў гвалтоўнага характару супраць сялянскіх актывістаў. Фіксаваліся асобныя выпадкі (якія, праўда, не мелі масавага сістэматычнага характару) прамога гвалту супраць прасавецкіх сялянскіх актывістаў. Так, у Хоцімскім раёне ў перыяд перавыбарчай кампаніі быў забіты актывіст — бядняк Дзёмкін, спалена сена старшыні камітэта сялянскай узаемадапамогі; у Пакалюбічах (Гомельскі раён) збіты камсамолец; у Гомельскім раёне здзейснілі замах на члена камітэта сялянскай узаемадапамогі і трох курсантаў саўпартшколы, якія праводзілі сход беднаты, і г. д.[47].

Як і ў папярэднія гады, напярэдадні выбарчых сходаў і непасрэдна на іх прыкметна ўзрастала актыўнасць заможнай часткі сялянства. Улады заўважалі, што мела месца *"правядзенне кулацкіх сходаў, агітацыя серадняка і бедняка, запалохванне, абяцанні, кампраметацыя асобных партыйных і савецкіх работнікаў, а то і ўсёй улады"*. З трывогай адзначалася вялікая актыўнасць кулацтва, яго "выкрутлівасць" і пераход "ад абароны да контратакі". Па інфармацыі з месцаў, *"дзякуючы сваёй арганізаванасці і згуртаванасці кулацка-заможны элемент вёскі <...> мае свой уплыў на частку больш заможнага серадняцтва, а часткова, у асобных выпадках, і бядняцтва"*[48].

У справаздачах бадзёра адзначалася, што пераважная частка сераднякоў ішла за беднатой, але разам з тым канстатавалася, што так і не ўдалося стварыць "блок беднаты і серадняка", у шэрагу выпадкаў серадняк *"пасіўны, вагаецца, больш заможная частка далучаецца да кулацтва, а бываюць выпадкі, калі ўсё серадняцтва ідзе за кулаком"*[49]. Падобная супярэчлівасць вынікала з загадзя пастаўленай перад партыйна-савецкімі органамі задачы: забяспечыць неабходны для ўлады вынік перавыбараў (бядняцка-серадняцкі склад сельсаветаў пры дамінаванні бядняцкага актыву), не ўпусціць пры гэтым прывесці доказы тэзісу аб масавым абвастрэнні класавай барацьбы ў вёсцы і пагрозе савецкай уладзе з боку заможнай часткі сялянства, упіраючы на яе арганізаванасць пры адсутнасці такой у беднаты і серадняка.

Зноў фіксавалася значная колькасць выпадкаў неправамернага пазбаўлення выбарчых правоў. Так, у Высачанскім раёне ў выбарчым праве адмовілі жыхарам, старэйшым за 60 гадоў, у Петрыкаўскім раёне — глуханямым, у Карэліцкім раёне — *"за рэлігійныя погляды"*, у Церахоўскім раёне — *"за дапамогу Амерыцы"*. У выніку ўжо пасля выбараў, у сакавіку 1929 г., Прэзідыум ЦВК БССР прыняў чарговую пастанову аб выпраўленні парушэнняў пры складанні спісаў асобаў, пазбаўленых выбарчых правоў[50].

Задача ўзмацнення ў складзе сельсаветаў "пралетарскіх слаёў" *вёскі была з поспехам выкананая.* ЦК КП(б)Б адзначаў *"паляпшэнне сацыяльнага складу сельсаветаў і ўзмацненне кіруючай ролі беднаты ў сельсаветах"*, што замацавала *"іх ролю органаў дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы"*[51]. Сярод радавых членаў сельсаветаў сялян-беднякоў (вызваленых ад сельгаспадатку) стала болей на 16,3%, сярод членаў прэзідыумаў — на 14,7%, старшынь — на 15,5%, членаў сельскіх рэвізійных камісій — на 9,8%. І зноў гэты рост апынуўся прыкладна сіметрычным павышэнню долі вызваленых ад выплаты сельгаспадатку сялян і адпаведнаму чарговаму пашырэнню катэгорыі "бедната". Законам аб сельгаспадатку на 1928/1929 гаспадарчы год павялічвалася абкладанне другарадных даходаў, працэнт надбавак на абкладаемы даход "моцных" гаспадарак, праводзілася індывідуальнае вызначэнне даходаў кулацкіх гаспадарак, а доля гаспадарак, цалкам вызваленых ад падатку, павялічылася з 26,9% да 35%. У выніку ўсе бядняцкія і маламоцныя гаспадаркі былі цалкам вызваленыя ад падатку, серадняцкія працоўныя гаспадаркі павышэнне падатку наогул не закранула, а асноўны цяжар падатку быў ускладзены на заможныя гаспадаркі[52].

Колькасць камуністаў і камсамольцаў у сельсаветах у абсалютных лічбах павялічылася, але доля іх з-за павелічэння агульнай колькасці членаў сельсаветаў у два разы зменшылася: камуністаў — з 9,3% да 9%, камсамольцаў — з 9% да 7,6%. У той жа час у прэзідыумах сельсаветаў удзельная вага камуністаў узрасла з 20,5% да 23,2%, сярод старшыняў — з 33,7% да 57,8%, у рэвізійных камісіях — з 8,5% да 11,3%[53].

Выбары гарадскіх саветаў прайшлі, як і ў 1927 г., больш спакойна для ўлады. Сацыяльны склад гэтых саветаў у параўнанні з 1927 г. практычна не змяніўся. Па-ранейшаму сярэднестатыстычным членам гарсавета быў мужчына, рабочы ці служачы, член (або кандыдат у члены) КП(б)Б.

У выніку на нізавым узроўні была створана неабходная аснова для фарміравання праўладнага складу дэлегатаў раённых, акруговых і рэспубліканскага з'ездаў Саветаў. Гэтыя з'езды прайшлі па загадзя падрыхтаваным сцэнарыі і, як і раней, забяспечылі неабходны уладам вынік пры фарміраванні выканаўчых органаў на ўсіх узроўнях кіраўнічай іерархіі. У галоўных структурах мясцовай улады камуністы атрымалі абсалютную большасць: у прэзідыумах райвыканкамаў — 78,9% членаў, гарсаветаў — 87%, акрвыканкамаў — 89,9%[54].

**Высновы.** Такім чынам, у гісторыі выбарчых кампаній 1920-х гг. у БССР можна вылучыць тры асноўныя перыяды. Агульным для іх з'яўлялася пастаяннае нагнятанне партыйнымі органамі абстаноўкі "абвастрэння класавай барацьбы" як ахоўнай рэакцыі на патэнцыяльныя пагрозы палітычнай уладзе бальшавікоў, зыходзячыя ад эканамічнай лібералізацыі часоў нэпа.

***Першы перыяд доўжыўся з 1921 г. па 1924 г.*** У яго пачатку (1921—1922 гг.) цікавасць сялян да выбараў у сельсаветы была вельмі нізкай. Ваенна-камуністычныя метады правядзення выбарчых кампаній, адсутнасць рэальных паўнамоцтваў і матэрыяльна-фінансавых сродкаў у сельсаветаў прыводзілі да масавага абсентэізму сялян. У такіх умовах для дасягнення неабходнага ўладам выніку вялікіх намаганняў не патрабавалася — часцей за ўсё было дастаткова простага выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу. Пачатак ажыццяўлення ў 1923 г. новай палітыкі "Тварам да вёскі" стымуляваў выбарчую актыўнасць сялянскага насельніцтва, аднак метады правядзення выбараў да 1925 г. у рэспубліцы практычна не мяняліся.

***Другі перыяд прыпаў на 1925—1926 гг.*** Пад ціскам саюзнага цэнтра беларускае партыйна-савецкае кіраўніцтва пайшло на перагляд і вынікаў выбараў 1924 г., і ўвогуле метадаў іх правядзення. Частковыя перавыбары 1925 г. у нізавыя Саветы прайшлі без традыцыйнага шырокага выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу, што дало насельніцтву больш магчымасцяў для выбару таго ці іншага кандыдата. Ранейшая звыклая для партыйных і савецкіх структур арыентацыя на бядняцкія пласты насельніцтва пры фарміраванні нізавых органаў мясцовай улады змянілася палітыкай іх "асераднячвання" Саветаў. Гэтая лінія была замацаваная ў перавыбарах 1926 г., якія афіцыйна прызналі як першыя "шырокія і дэмакратычныя" выбары пасля завяршэння Грамадзянскай вайны. Дэмакратычны характар выбараў у дадзеным выпадку цалкам упісваўся ў прынятае ў СССР у 1920-я гг. паняцце "савецкая дэмакратыя", для якой натуральным лічылася наяўнасць непрапарцыянальнай сістэмы прадстаўніцтва гарадскога і сельскага насельніцтва ў органах улады, шматлікасць катэгорый пазбаўленых выбарчых правоў асобаў, адкрытае галасаванне па кандыдатурах, галасаванне спісамі і г. д. Тым не менш у сярэдзіне 1920-х гг. выбары рэальна ператварыліся ў месца палітычнай барацьбы за масы сялянства паміж уладай і заможнай часткай насельніцтва вёскі. За рэдкім выключэннем гэта сапраўды была менавіта палітычная барацьба за серадняка з выкарыстаннем абодвума бакамі падобных сродкаў і метадаў агітацыі, у якой улада мела непараўнальна большыя магчымасці, сродкі і рэсурсы. І вынікі выбараў сведчылі, што выйграла гэтую барацьбу ўлада — серадняк паверыў у яе, пайшоў у сельскія Саветы, заняў у іх у 1925 і 1926 гг. кіруючае становішча, адціснуўшы беднату.

***Трэці перыяд пачаўся з 1927 г.***, калі была рэалізавана ідэя першачарговай апоры ўладаў на бедняка. Пачалося згортванне новай эканамічнай палітыкі, на першы план выйшлі задачы непасрэднага будаўніцтва сацыялізму, у тым ліку і ў вёсцы. Курс "Тварам да вёскі" быў заменены курсам на калектывізацыю сельскай гаспадаркі, у рэалізацыі якога партыйна-савецкія ўлады бачылі галоўнай сваёй сацыяльнай апорай і рухаючай сілай "найбольш пралетарскія" пласты — беднату, парабкаў і сельгасрабочых. З 1927 г. цэнтральным кірункам дзейнасці ўсіх партыйных і савецкіх органаў у перавыбарчых кампаніях зноў стала праца з вясковай беднатой і забеспячэнне за ёй вырашальных пазіцый у сельсаветах. У арганізацыі і правядзенні перавыбараў узмацнілася выкарыстанне рознага роду адміністрацыйных рэсурсаў (у тым ліку рост колькасці пазбаўленых выбарчага права, павелічэнне складу членаў сельсаветаў, рэарганізацыя выбарчых участкаў).

---

[1] Ленин В.И. К четырехлетней годовщине Октябрьской революции // Ленин В.И. Полное собрание сочинений. Изд. 5. Т. 44. Июль 1921 — март 1922 г. С. 147.

[2] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 2 (1917—1924 гг.). М., 1970. С. 42.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 34, воп. 1, спр. 19, арк. 11—13; Спр. 250, арк. 1, 32-33.

[4] Там жа. Спр. 251, арк. 24 — 24 адв.

[5] Там жа. Спр. 55, арк. 50 — 52 адв., 63-64, 161 — 161 адв.

[6] Там жа. Спр. 345, арк. 78.

[7] Падлічана аўтарам па: НАРБ. Ф. 7, воп. 1, спр. 1054, арк. 1, 14.

[8] Падлічана аўтарам па: НАРБ. Ф. 7, воп. 1, спр. 1054, арк. 4 адв. — 10.

[9] НАРБ. Ф. 34, воп. 1, спр. 345, арк. 121 — 124 адв., 158, 175а.

[10] Там жа. Ф. 7, воп. 1, спр. 376, арк. 81а — 83.

[11] Там жа. Ф. 4п., воп. 1, спр. 2191, арк. 40—45.

[12] Там жа. Спр. 1269, арк. 18—20; Спр. 2191, арк. 20—24, 35-36.

[13] Там жа. Спр. 2191, арк. 36.

[14] Там жа. Арк. 37.

[15] Там жа. Ф. 6, воп. 1, спр. 422, арк. 61-62.

[16] Там жа. Ф. 4п., воп. 1, спр. 1989, арк. 7-8 адв.

[17] Там жа. Ф. 6, воп. 1, спр. 578, арк. 7.

[18] Там жа. Ф. 4п., воп. 1, спр. 2191, арк. 149.

[19] Там жа. Арк. 149, 158-159.

[20] Там жа. Арк. 149—151

[21] Там жа. Арк. 154.

[22] Там жа. Арк. 154-155.

[23] Там жа. Ф. 34, воп. 1, спр. 477, арк. 193-194.

[24] Там жа. Ф. 34, воп. 1, спр. 477, арк. 33; Ф. 4п., воп. 1, спр. 2282, арк. 52.

[25] Там жа. Ф. 34, воп. 1, спр. 477, арк. 332, 335; Спр. 2282, арк. 341.

[26] Там жа. Спр. 477, арк. 334.

[27] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 2282, арк. 64.

[28] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 2 (1917—1924 гг.). С. 148-149.

[29] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 2282, арк. 354.

[30] Дзейнасць Урада БССР за 1926—27 год. Мн., 1928. С. 260.

[31] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 2282, арк. 381.

[32] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 939, арк. 13 — 22 адв.

[33] Асноўныя вынікі работы Урада БССР. Мн., 1928. С. 5.

[34] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 3 (1924—1927 гг.). С. 333, 342.

[35] Там жа. С. 334-335.

[36] Там жа. С. 445-446.

[37] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 3489, арк. 15-16.

[38] Дзейнасць Урада БССР за 1926—27 год. С. 260.

[39] Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага камітэту на XI-ым з'езде КП(б)Б. Мн., 1927. С. 51

[40] Там жа. С. 76-77.

[41] Дзейнасць Урада БССР за 1926—27 год. С. 258.

[42] Там жа. С. 266.

[43] Там жа. С. 263, 265.

[44] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. *Т. 4 (1927—1931 гг.). М., 1970. С. 17, 68.*

[45] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов: в 6 т. Т. 2: 1928—1932. 1984. С. 60.

[46] Там жа. С. 73—78.

[47] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 4532, арк. 24 адв.

[48] Там жа. Арк. 20-21, 24.

[49] Там жа. Арк. 21-22, 25-26.

[50] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 3803, арк. 87-88.

[51] Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага камітэту КП(б)Б. Мн., 1930. С. 78.

[52] Ад з'езду да з'езду (красавік 1927 г. — май 1929 г. ). Матэрыялы да спрваздачы Ураду на IX Усебеларускім з'езду саветаў. Мн., 1929. С. 25, 343-344.

[53] Там жа. С. 24-25.

[54] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 4350, арк. 12.